**Вучэбная дысцыпліна “Уводзіны ў славянскую філалогію”**

| | |
|---|---|
| **Месца дысцыпліны ў структурнай схеме адукацыйнай праграмы** | Адукацыйная праграма бакалаўрыята (агульная вышэйшая адукацыя)<br>Спецыяльнасць: 6-05 0232 -01 Беларуская філалогія<br>Дысцыпліна дзяржаўнага кампанента<br>Прапедэўтычны модуль |
| **Кароткі змест** | Прадмет і задачы славянскай філалогіі. Славянскія народы. Геаграфічна-гістарычная характарыстыка славянскіх народаў. Час і месца фарміравання славянаў. Арэал пражывання славянаў. Сучасны стан славянскіх дзяржаў і народаў. Канфесійная прыналежнасць славянаў. Праіндаеўрапейская мова. Праславянская мова, час яе існавання і перыядызацыя. Славянскія мовы: усходнеславянская група моў. Славянскія мовы: заходнеславянская група моў. Славянскія мовы: паўднёваславянская група моў. Славянскае пісьменства. Славістыка на сучасным этапе. Актуальныя задачы славістыкі. |
| **Фарміруемые кампетэнцыі, вынікі навучання** | У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен **ведаць:** найбольш пашыраныя гіпотэзы паходжання славянаў і месцазнаходжання іх прарадзімы; кантакты славянаў у старажытнасці з іншымі еўрапейскімі народамі; – адметнасці духоўнай і матэрыяльнай культуры славянаў; фанетычна-граматычныя і графічныя асаблівасці славянскіх моў, важныя звесткі пра гістарычны лёс іх носьбітаў; гісторыю станаўлення славянскай філалогіі; сучасную праблематыку славістычнай навукі; асноўную навуковую і даведачную літаратуру па дадзенай вучэбнай дысцыпліне; **умець:** адбіраць, аналізаваць і сістэматызаваць моўныя факты; праводзіць самастойныя лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады; заўважаць агульнае і адметнае ў навуковых фактах пра славянскія мовы; карыстацца разнастайнымі славянскімі слоўнікамі, вучэбнымі дапаможнікамі і даведачнай літаратурай.<br>Засваенне праграмы павінна забяспечыць фарміраванне кампетэнцыі<br>БПК-15 – прымяняць у прафесійнай дзейнасці веды аб дасягненнях філалагічных дысцыплін, якія вывучаюць матэрыяльную і духоўную культуру славянскіх народаў. |
| **Прэрэквізіты** | Сучасная беларуская мова, гісторыя беларускай літатарурнай мовы |
| **Працаёмкасць** | Агульная колькасць гадзін па дысцыпліне – 90 (3 заліковыя адзінкі). Колькасць аўдыторных гадзін – 42, з іх лекцыйных – 26, практычных – 16. |
| **Семестр(ы), патрабаванні і формы бягучай і прамежкавай атэстацыі** | 1 семестр, тэставыя заданні, залік. |